# Тэма 1 ГЕАГРАФІЧНАЕ СТАНОВІШЧА І ДАСЛЕДАВАННІ БЕЛАРУСІ



## § 1. Геаграфічнае становішча

***Успомніце.*** *Якія асаблівасці прыроды залежаць ад фізіка-геаграфічнага становішча краіны? Якія геаграфічныя паясы вылучаюцца на зямным шары? Чаму памеры тэрыторыі краіны ўплываюць на магчымасці яе гаспадарчага развіцця?*

Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава, прэзідэнцкая рэспубліка, паўнапраўны член сусветнай супольнасці. Як суверэнная дзяржава, яна мае дзяржаўныя сімвалы: Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг (мал. 1) і Дзяржаўны гімн. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН Беларусь адносіцца да краін Усходняй Еўропы.

Што азначаюць колеры Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і элементы Дзяржаўнага герба?




Мал. 1. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь

**1. Ацэнка фізіка-геаграфічнага становішча.** Геаграфічнае становішча краіны з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў сацыяльна-эканамічнага развіцця. У любой краіны яно ўнікальнае, бо залежыць ад яе размяшчэння на зямным шары. Геаграфічнае становішча краіны, у першую чаргу, вызначае колькасць сонечнай энергіі, якая паступае і з'яўляецца крыніцай фізіка-геаграфічных працэсаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У залежнасці ад размяшчэння тэрыторыі краіны адносна прыродных, адміністрацыйных або сацыяльна-эканамічных аб'ектаў вылучаюць фізіка-геаграфічнае і эканоміка-геаграфічнае становішча.

Выгадным геаграфічным становішчам краіны лічыцца яе размяшчэнне на беразе мора, на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, на тэрыторыі з мяккім кліматам і разнастайнымі прыроднымі рэсурсамі. Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Беларусі спрыяльныя для гаспадарчага развіцця краіны, а якія яго стрымліваюць?

Фізіка-геаграфічнае становішча Беларусі з'яўляецца спрыяльным для асваення яе тэрыторыі, сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, фарміравання камфортнага асяроддзя жыццядзейнасці насельніцтва.

**Фізіка-геаграфічнае становішча** — становішча геаграфічных аб'ектаў адносна сістэмы каардынат, прыродных аб'ектаў, з якімі яны знаходзяцца ва ўзаемадзеянні.

Беларусь размешчана ў межах умеранага геаграфічнага пояса паміж 51 і 56° пн. ш. Самы паўночны пункт знаходзіцца ў Верхнядзвінскім раёне на поўнач ад Асвейскага возера, а паўднёвы — у Брагінскім раёне каля пасёлка гарадскога тыпу (п. г. т.) Камарын. Крайні заходні пункт размешчаны паблізу горада Высокае Камянецкага раёна, усходні — недалёка ад п. г. т. Хоцімск (мал. 2).

Успомніце, чаму геаграфічны пояс называецца ўмераным.




Мал. 2. Канфігурацыя і дзяржаўныя межы Рэспублікі Беларусь

Па разліках геадэзістаў, недалёка ад Мінска, каля вёскі Антанова Пухавіцкага раёна, знаходзіцца геаграфічны цэнтр краіны з каардынатамі 53°32´ пн. ш., 28°03´ у. д.

**Геаграфічны цэнтр** — пункт, роўнааддалены ад меж тэрыторыі.

Беларусь знаходзіцца на старажытнай Усходне-Еўрапейскай платформе, таму на тэрыторыі нашай краіны не бывае разбуральных землетрасенняў і няма вулканаў. Нетры Беларусі багатыя на мінеральную сыравіну асадкавага паходжання, перш за ўсё будаўнічыя матэрыялы. Тэрыторыя краіны размешчана ў межах Усходне-Еўрапейскай раўніны на водападзеле басейнаў рэк Балтыйскага і Чорнага мораў. Раўнінны рэльеф спрыяльны для сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і іншых відаў гаспадарчай дзейнасці.

У Беларусі ўмераны, пераходны ад марскога да кантынентальнага клімат з параўнальна цёплымі зімой і летам, працяглым вегетацыйным перыядам, дастатковай колькасцю ападкаў і няўстойлівым надвор'ем. Клімат дазваляе вырошчваць тыповыя для ўмеранага кліматычнага пояса сельскагаспадарчыя культуры.

Беларусь добра забяспечана воднымі рэсурсамі. Аднак перавага малых вадацёкаў і раўнінны характар рэльефу абумовілі нізкі гідраэнергетычны патэнцыял рэк і невялікае іх транспартнае значэнне. Маляўнічыя азёры на тэрыторыі краіны выкарыстоўваюцца ў рэкрэацыйных мэтах.

Геаграфічнае становішча абумовіла фарміраванне на тэрыторыі Беларусі занальных дзярнова-падзолістых глеб, якія даюць магчымасць збіраць высокія ўраджаі сельскагаспадарчых культур пры выкарыстанні сучасных агратэхналогій. Прыроднае расліннае покрыва прадстаўлена лясной, лугавой, балотнай і воднай расліннасцю. Беларусь характарызуецца высокай лясістасцю (больш за 40 %), вялікімі плошчамі балот і багатай відавой разнастайнасцю расліннага і жывёльнага свету.

**2. Ацэнка эканоміка-геаграфічнага становішча.** Для многіх краін эканоміка-геаграфічнае становішча з'яўляецца або стрымальным, або стымулюючым фактарам іх сацыяльна-эканамічнага развіцця. На яго ўплываюць размяшчэнне краіны ў цэнтры ці на перыферыі, наяўнасць выхаду да мора, узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця суседніх краін, аддаленасць крыніц сыравіны і энергіі, праходжанне транспартных шляхоў і г. д. Эканоміка-геаграфічнае становішча Беларусі можна



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

лічыць спрыяльным. У якасці ключавых яго характарыстык вылучаюцца цэнтральнасць і транзітнасць.

Цэнтральнасць садзейнічае развіццю гандлю з краінамі Еўропы і Азіі, стварае ўмовы для развіцця транспартна-лагістычнага комплексу. Беларусь на працягу многіх гадоў выступала, з аднаго боку, у ролі «буфера», з другога — «моста» паміж еўрапейскімі краінамі і Расіяй, а таксама краінамі Азіі.

Транзітнасць абумоўліваецца транспартна-геаграфічным становішчам Беларусі. Праз тэрыторыю краіны праходзяць транзітныя шляхі, якія злучаюць краіны Паўночнай і Паўднёвай, Заходняй і Усходняй Еўропы. З дзесяці транс'еўрапейскіх транспартных калідораў два праходзяць праз нашу краіну: II Берлін — Ніжні Ноўгарад і IX Хельсінкі — Александрупаліс з адгалінаваннем Гомель — Калінінград. Таксама праз Беларусь праходзяць магістральныя нафта- і газаправоды з Расіі ў Еўропу.

По карце атласа (с. 66–67) вызначце, праз якія краіны і буйныя гарады Беларусі праходзяць гэтыя транспартныя калідоры.

Сучаснае геапалітычнае становішча ў Еўропе і свеце стымулюе развіццё новых кірункаў узаемадзеяння з краінамі Азіі.

Перспектыўным для Беларусі з'яўляецца ўдзел у развіцці пан'еўразійскай чыгункі «Новы шаўковы шлях», якая злучае Кітай з краінамі Еўропы.

Недахопам эканоміка-геаграфічнага становішча Беларусі з'яўляецца адсутнасць выхаду да мора. Але ў цэлым яно садзейнічае развіццю эканамічных сувязей з рознымі краінамі.

**3. Памеры тэрыторыі.** Важным паказчыкам геаграфічнай характарыстыкі краіны з'яўляецца велічыня тэрыторыі. Чым большыя тэрыторыі, тым больш разнастайныя яе прыродныя ўмовы, больш багатыя прыродныя рэсурсы і, такім чынам, больш высокі патэнцыял эканамічнага развіцця.

Беларусь па памерах тэрыторыі адносіцца да сярэдніх краін. Яе плошча — 207,6 тыс. км$^2$. Сярод 193 дзяржаў — членаў ААН Беларусь па плошчы займае 84-е месца, а сярод еўрапейскіх дзяржаў — 13-е. Беларусь значна саступае Расіі, Украіне, Францыі, Іспаніі, Швецыі. У той жа час яна прыкладна ў два разы большая за Балгарыю, Ісландыю. Найбольш блізкія па плошчы краіны Еўропы — Румынія і Вялікабрытанія.

Другім паказчыкам характарыстыкі тэрыторыі краіны з'яўляецца яе канфігурацыя (ці контур). Яна можа садзейнічаць развіццю або стрымліваць яго, таму што на гаспадарчую дзейнасць уплывае адлегласць паміж сталіцай і прамысловымі цэнтрамі, іх аддаленасць ад дзяржаўнай мяжы, радовішчаў карысных выкапняў і г. д.

Тэрыторыя Беларусі кампактная, па сваёй форме нагадвае пяцівугольнік. З поўначы на поўдзень яна распасціраецца на 560 км, з захаду на ўсход — на 650 км (мал. 2). Пра кампактнасць тэрыторыі сведчаць суадносіны паміж плошчай краіны і працягласцю яе меж. Для Беларусі розніца гэтых паказчыкаў меншая, чым для многіх краін свету. Чым складанейшая канфігурацыя тэрыторыі краіны, тым меншая яе кампактнасць.

Беларусь размешчана ў цэнтры Еўропы. Разлікі беларускіх навукоўцаў паказалі, што геаграфічны цэнтр Еўропы знаходзіцца ў Беларусі недалёка ад г. Полацка, дзе ўстаноўлены памятны знак (мал. 3).



Мал. 3. Геаграфічны цэнтр Еўропы

**4. Дзяржаўныя межы.** Рэспубліка Беларусь мяжуе з пяццю краінамі: Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй. Агульная працягласць дзяржаўнай мяжы складае 3617 км. Самы працяглы ўчастак — з Расіяй (1283 км) на паўночным усходзе і ўсходзе краіны. Трохі карацейшая мяжа з Украінай — 1084 км. Яна цягнецца на поўдні краіны па Палессі ў шыротным напрамку. На захадзе на працягу 398 км Беларусь мяжуе з Польшчай. Паўночна-заходняя мяжа Беларусі з Літвой (679 км) і Латвіяй (173 км) найбольш звілістая. Дзяржаўная мяжа Беларусі не мае відавочных прыродных рубяжоў, але месцамі праходзіць па рэках і азёрах. У многіх месцах межы краіны перасякаюцца аўтамабільнымі дарогамі і чыгункамі, нафта- і газаправодамі.

Якія рэкі і азёры з'яўляюцца памежнымі альбо перасякаюць мяжу Беларусі (с. 6–7 атласа)?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Падвядзём вынікі.** Беларусь характарызуецца выгадным фізіка-геаграфічным і эканоміка-геаграфічным становішчам. Беларусь — сярэдняя па памерах краіна Еўропы плошчай 207,6 тыс. км$^2$, размешчаная ў цэнтры Еўропы. Працягласць дзяржаўнай мяжы Беларусі з Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй складае 3617 км.

***Праверце сябе.*** 1. У чым адрозненне фізіка-геаграфічнага становішча тэрыторыі ад эканоміка-геаграфічнага? 2. Дзе знаходзяцца геаграфічны цэнтр Беларусі і геаграфічны цэнтр Еўропы? 3 З якімі краінамі мяжуе Беларусь? Пералічыце іх па меры змяншэння працягласці меж.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Вызначце асноўныя станоўчыя і адмоўныя асаблівасці фізіка-геаграфічнага і эканоміка-геаграфічнага становішча Беларусі. 2. Якая вобласць Беларусі мяжуе з найбольшай колькасцю краін? 3. Якія вобласці Расіі і Украіны мяжуюць з Беларуссю?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Разлічыце, у колькі разоў большая або меншая тэрыторыя Беларусі ў параўнанні з тэрыторыямі краін-суседак.

## § 2. Фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

***Успомніце.*** *У склад якіх дзяржаў уваходзіла тэрыторыя Беларусі на працягу гістарычнага развіцця? Якія адзінкі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу прымяняюцца ў краінах свету? Для чаго праводзіцца адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел?*

**1. Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі.** Межы краін свету ўвесь час змяняюцца. Для Беларусі, якая размешчана ў цэнтры Еўропы, характэрна складаная гісторыя фарміравання тэрыторыі. Гэта абумоўлена пастаянным сутыкненнем палітычных інтарэсаў розных краін.

З урокаў гісторыі Беларусі вы ведаеце, што ў X ст. на землях сучаснай Беларусі ўзніклі першыя формы дзяржаўнасці — Полацкае і Тураўскае княствы, якія дасягнулі росквіту ў XI ст. У XIII–XVIII стст. тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Тэрытарыяльную аснову ВКЛ складалі сучасныя беларускія землі, а дзяржаўнай мовай была старабеларуская. З другой паловы XVI ст. да канца XVIII ст. землі ВКЛ уваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Напрыканцы XVIII ст. пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі і заставаліся ў ёй да 1917 г.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і заканчэння Першай сусветнай вайны 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Сацыялістычная